# Пранікнёна і шчыра

**30 студзеня ў зале беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася цёплая сустрэча з вядомым беларускім паэтам, празаікам і публіцыстам Змітраком Марозавым у рамках цыкла «20 пытанняў пісьменніку».**

Гэта была не проста літаратурная вечарына — адбыўся сапраўдны дыялог сэрцаў. Пісьменнік дзяліўся сваімі развагамі пра літаратуру, натхненне і любоў да беларускай мовы, расказваў пра значэнне гістарычнай і культурнай спадчыны ў сваёй творчасці. Асаблівае месца ў яго выступленні займала беларуская вёска — яе вобраз прысутнічае ў многіх творах аўтара.

Сустрэча запомнілася не толькі эмацыянальнымі вершамі, якія чытаў сам аўтар, але і жывой цікавасцю слухачоў. Асабліва натхняльным быў момант, калі адзін са школьнікаў, які толькі пачынае свой шлях у літаратуры, задаў пісьменніку шмат пытанняў: як знайсці свой стыль, дзе шукаць натхненне, як выдаць першую кнігу? Змітрок Марозаў з вялікай ахвотай дзяліўся парадамі, заклікаючы юнага аўтара не баяцца выпрабаванняў і верыць у сваю творчую місію.

Кульмінацыяй вечара стала чытанне вершаў пісьменніка. Яго радкі гучалі настолькі шчыра і пранікнёна, што ў вачах аўтара нават з'явіліся слёзы. Гэта быў сапраўдны момант яднання, калі паэзія загучала не толькі ў словах, але і ў сэрцах прысутных.

Арганізатары мерапрыемства — Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Саюз пісьменнікаў Беларусі — выказваюць удзячнасць усім, хто далучыўся да гэтай незабыўнай літаратурнай імпрэзы, і спадзяюцца на новыя сустрэчы.

**Маргарыта РЫБАЛТОЎСКАЯ**